УДК 343.985

*А.Я. Гучок*

# АСОБНЫЯ ЛАГІЧНЫЯ ПАДСТАВЫ ІНІЦЫЯВАННЯ ПАЗНАВАЛЬНАГА ПРАЦЭСУ ОРГАНАЎ ДАЗНАННЯ

У якасці аднаго з кірункаў павышэння эфектыўнасці аператыўна-вышуковага забеспячэння дзейнасці па папярэджанню, выяўленню і раскрыццю злачынстваў можа разглядацца аналітычная дзейнасць па ўстанаўленню на аснове агульнадаступных звестак пра асоб, аб'екты, падзеі лагічных падстаў, якія дазваляюць ініцыяваць у іх дачыненні пазнавальны працэс органаў дазнання. Выніковасць пошуку названых падстаў залежыць ад выкарыстоўваемых падыходаў да фармалізацыі ведаў аб рыхтуемых злачынствах, а менавіта такіх падыходаў, якія дазваляюць забяспечыць эфектыўнае выяўленне ў фармалізаваных ведах узаемасувязяў і залежнасцяў і адпаведна выказаць здагадку аб магчымай падрыхтоўцы да ўчынення злачынства. Вядома, што ў структуры фармалізаваных ведаў павінна ляжаць некаторая колькасць аксіём, на аснове якіх могуць будавацца ў дастатковай ступені абгрунтаваныя здагадкі.

Так, у крыміналістыцы вылучаюць шэраг аксіём, мяркуючы, што пры фармалізацыі ведаў пра злачынства без доказаў неабходна прыняць наступныя бясспрэчныя сцвярджэнні: злачынства адлюстроўваецца ў навакольным асяроддзі, а яго матэрыяльныя элементы падвяргаюцца ўздзеянню асяроддзя, што прыводзіць да ўтварэння слядоў; сляды злачынства з'яўляюцца крыніцамі звестак пра абставіны ўчыненага злачынства; злачынства пазнаецца па пакінутых ім слядах.

Названыя аксіёмы разам з наяўнымі фактычнымі дадзенымі выступаюць у якасці пасылак, з якіх робіцца выснова аб сутнасці даследуемай падзеі. Пры фармалізацыі ведаў фармуляванне аксіём можа грунтавацца на выкарыстанні першаснай сувязі «калі... то...», якая адлюстроўвае наяўнасць падставы і таго, што абгрунтоўваецца. Вылучэнне гэтай сувязі дазваляе засяродзіць увагу на канцэптуальнай сістэме, якая складаецца як мінімум з двух элементаў. У рэальнасці сістэма фармалізуемых ведаў (фармалізаваных ведаў) уяўляе сабой мноства сувязяў, якія выступаюць у арганічным адзінстве паміж сабой. Веданне такіх сувязяў паміж даследуемымі аб'ектамі, іх прыкметамі і адлюстраваннямі забяспечвае магчымасць у пэўных сітуацыях устанаўліваць адны з узаемазвязаных аб'ектаў, падзей, з'яў, іх прыкмет і адлюстраванняў па значэннях іншых. На гэтай жа аснове можна прагназаваць магчымасць наступу пэўных падзей, у тым ліку і злачынных.



Разгледжаны падыход дазваляе будаваць высновы, якія апісваюць адносіны паміж рознымі элементамі матэрыяльнай структуры злачынства, а таксама паміж элементамі і адлюстраваннямі, што ўзнікаюць з прычыны функцыянавання сувязяў ўзаемадзеяння і г. д. Напрыклад, калі існуе сістэма, то паміж яе элементамі існуюць сувязі; калі існуюць сувязі, то існуюць і адлюстраванні; калі існуюць адлюстраванні, то могуць існаваць сляды, прыдатныя для ідэнтыфікацыі; калі выяўленыя сляды прыдатныя для ідэнтыфікацыі, то могуць быць устаноўлены аб'екты, якія пакінулі іх.

У дачыненні да праблемы вызначэння падстаў ініцыявання пачатку пазнавальнага працэсу ў аператыўна-вышуковай дзейнасці мы будзем весці гаворку пра верагодныя намеры пэўных асоб учыніць злачынства вызначаным спосабам. Прычым паказчыкамі такіх намераў будзе разглядацца наяўнасць у іх спалучэння пэўных сродкаў, прыбораў, прылад.

Даказванне эфектыўнасці разглядаемага падыходу ажыццяўляецца намі з дапамогай аналізу мадэляў сітуацый магчымага ўчынення злачынстваў, прадугледжаных арт. 282 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь (незаконнае паляванне), прычым спосабамі, невядомымі аператыўна-следчай практыцы, у прыватнасці праз выкарыстанне радыёкіруемых дронаў, абсталяваных функцыяй відэатрансляцыі. Названая тэхнічная прылада можа прымяняцца як сродак незаконнага палявання «з падыходу», забяспечваючы ўстанаўленне месца знаходжання дзікіх жывёл (аб'ектаў палявання), і кантролю за іх перамяшчэннем пры набліжэнні да іх з падветранага боку на адлегласць стрэлу. Пры пэўных сітуацыях дроны могуць выконваць функцыю, якая забяспечвае загон аб'ектаў палявання шляхам стварэння ўмоў, не характэрных для асяроддзя іх пражывання (набліжэнне лятаючага тэхнічнага сродку) і ўспрымаемых жывёламі як небяспека, што прымушае аб'екты палявання перамяшчацца ў меркаваным (на «нумары») напрамку. Так, патурбаваная чарада дзікіх качак пералятае ад аднаго вадаёма да іншага, блізкага вадаёма, што можа быць лёгка спрагназавана.

На аснове аналізу разгледжанага спосабу вядзення незаконнага палявання могуць быць сфармуляваны наступныя аксіёмы:

калі ў грамадзяніна маецца зарэгістраваная паляўнічая зброя, то набыццё дрона пэўнай канструкцыі, у прыватнасці «Sprite», паказвае на магчымыя намеры вядзення незаконнага палявання;

калі грамадзянінам набываецца дрон не дзеля мэтаў фота-, відэаздымкі і г. д. і ён пражывае на тэрыторыі, якая прымыкае да паляўнічых угоддзяў, то магчыма выкарыстанне названага лятальнага апарата ў мэтах вядзення незаконнага палявання з дапамогай сродкаў, якія не патрабуюць рэгістрацыі (лукі, арбалеты і інш.);

калі грамадзянін, які пражывае на тэрыторыі, што прымыкае да паляўнічых угоддзяў, валодае дронам, то ён можа быць уладальнікам незарэгістраванай агнястрэльнай зброі і г. д.

Аналагічным чынам могуць прагназавацца канкрэтныя месцы і час вядзення незаконнага палявання з выкарыстаннем названых сродкаў, магчымыя шляхі падыходу і адыходу злачынцаў, спосабы ўтойвання слядоў злачынства і інш. Выкладзенае, у сваю чаргу, дазваляе выяўляць падставы ініцыявання пазнавальнага працэсу ў аператыўна-вышуковай дзейнасці, а таксама ўдасканальваць методыкі выяўлення, раскрыцця і расследавання злачынстваў, спосабы і сродкі ўчынення якіх у аператыўна-следчай практыцы яшчэ не атрымалі пашырэння.

УДК 343.985.8

*М.Д. Драгун*

## ОТДЕЛЬНЫЕ АСПЕКТЫ ПРОТИВОДЕЙСТВИЯ ОПЕРАТИВНО-РОЗЫСКНОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ

В современных условиях вопросы противодействия оперативно-розыскной деятельности со стороны заинтересованных лиц приобретают все более актуальный характер, так как оно оказывает непосредственное влияние на эффективность ОРД.

До настоящего времени учеными Республики Беларусь и Российской Федерации изучались в основном вопросы противодействия предварительному расследованию, а также разрабатывались меры по его преодолению. Этой тематике посвящены работы Б.В. Асаёнка, Э.У. Бабаевой, Р.С. Белкина, В.Ф. Ермоловича, С.Ю. Журавлёва, В.Н. Карагодина, А.Е. Маслова, О.В. Маслова, Р.Ш. Осипяна, О.Л. Стулина и др. Вопросы преодоления противодействия ОРД фактически не рассматривались в специальной литературе.

Некоторые авторы указывают, что противодействие ОРД оказывается гораздо реже либо не оказывается вовсе вследствие конспиративного характера действий оперативно-розыскных органов, негласности проводимых мероприятий, т. е. заинтересованные лица не могут знать об осуществлении в отношении них ОРД. Тем не менее 64 % опрошенных нами оперативных сотрудников органов государственной безопасности выявляли факты оказания противодействия ОРД, при этом 70 % из них указали, что противодействие ОРД действительно является фактором, снижающим эффективность их деятельности. Данные обстоятельства



свидетельствуют о том, что в настоящее время оперативная практика испытывает необходимость в разработке данной проблемы.

Анализ литературы, а также результаты проведенного исследования проблемы противодействия ОРД позволяют выделить его характерные черты:

противодействие ОРД представляет собой умышленные деяния (действия или бездействие) субъектов противодействия – проверяемых (разрабатываемых) лиц, а также лиц, с ними связанных;

деяния субъектов противодействия направлены на воспрепятствование правомерной деятельности оперативных сотрудников по решению задач ОРД;

целью противодействия ОРД является прекращение или затруднение правомерной деятельности оперативных сотрудников по решению задач ОРД либо изменение ее характера в выгодном для субъектов противодействия направлении.

Таким образом, противодействие ОРД целесообразно рассматривать как умышленные деяния (действия или бездействие) проверяемых (разрабатываемых) лиц, а также лиц, с ними связанных, направленные на воспрепятствование правомерной деятельности оперативных сотрудников по решению задач ОРД с целью ее прекращения или затруднения либо изменения ее характера в выгодном направлении для проверяемых (разрабатываемых) лиц, а также лиц, с ними связанных.

Выбор способа оказания противодействия зависит от совокупности объективных и субъективных факторов, детерминирующих противодействие ОРД. Под объективными факторами необходимо понимать явления, предметы, процессы, условия, существующие независимо от сознания людей. В данном случае субъект противодействия либо использует в своих целях условия благоприятной обстановки, либо приспосабливается к существующим, либо изменяет их или подыскивает более удобные. К объективным факторам следует отнести отдельные пробелы в законодательстве; обстоятельства, обусловливающие возможность получения субъектом противодействия информации о проводимой в отношении его ОРД; низкий уровень материально-технического обеспечения субъектов ОРД; недостаточно высокий уровень деловых и личностных качеств отдельных оперативных сотрудников (в ходе опроса отдельные сотрудники указали, что несоблюдение ими мер конспирации привело к оказанию противодействия).

Субъективные факторы, как правило, предопределяются личностью субъекта противодействия. Это наличие преступного опыта, знание средств и методов ОРД и т. д.